ISSN 2078-5119. Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Вип. 71. Ч. ІІ. С. 437–447
Visnyk of Lviv University. Series Philology. Iss. 71. Vol. II. P. 437–447

*УДК 81'373.2 : 02*

**doi: http://dx.doi.org/10.30970/vpl.2019.71.10389**

# ПРЭСОНІМ ЯК АБ'ЕКТ БЕЛАРУСКАЙ АНАМАСТЫКІ

**Вікторыя СІМАНОВІЧ**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі,*
*вул. Савецкая 18, Мінск, Беларусь,*
*тэл. (37517)3278044*
*e-mail: simonovich.viktorija@mail.ru*

Разглядаецца статус прэсоніма як анамастычнай адзінкі. Абгрунтаваны тэрмін "прэсонім" для абазначэння сукупнасці назваў газет і часопісаў. Прааналізаваны асноўныя асаблівасці найменняў беларускіх перыядычных выданняў на розных узроўнях: даследаваны структурна-граматычныя асаблівасці беларускай прэсаніміі, прааналізаваны асобныя семантычныя групы назваў газет і часопісаў, асвятляецца праблема дэнамінацыі перыядычных выданняў. Абгрунтоўваецца палажэнне, што беларуская прэсанімія – разгалінаваная сістэма, арганізаваная на фармальным, семантычным і прагматычным узроўнях.

*Ключавыя словы*: анамастыка, онім, ідэонім, прагматонім, гемеронім, прэсонім, кампанент прэсоніма, кампанент-маркёр, дэнамінацыя.

**Пастаноўка праблемы.** Уласныя імёны часта прыцягваюць увагу вучоных з пункту гледжання іх лінгвістычнага апісання. У сваю чаргу адны групы онімнай лексікі даследаваны і апісаны дастаткова падрабязна, іншыя – не з'яўляліся аб'ектам лінгвістычнага аналізу. Так, недаследаванымі ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве застаюцца многія класы ўласных імён, якія адносяцца да перыферыйнай анамастычнай прасторы, у прыватнасці, назвы перыядычных выданняў.

Мэтай работы з'яўляецца прадстаўленне беларускай прэсаніміі як сістэмы онімаў, якая валодае спецыфічнымі структурна-граматычнымі, семантычнымі, прагматычнымі характарыстыкамі.

**Актуальнасць даследавання.** Назвы газет і часопісаў не атрымалі поўнага апісання ў лінгвістычнай літаратуры. Ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве зафіксаваны толькі адзінкавыя публікацыі, прысвечаныя апісанню прэсонімаў. Так, у функцыянальна-прагматычным аспекце назвы газет і часопісаў аналізаваліся Л. Р. Мухаметзянавай [15], а ў беларускім мовазнаўстве маецца толькі артыкул Л. Гадуйка і А. Сцеранчук [6], прысвечаны аналізу найменняў прэсы горада Брэста. Такім чынам, актуальнасць дадзенай работы абумоўлена неабходнасцю вывучэння недаследаваных і маладаследаваных аспектаў беларускай анамастыкі, несістэматызаванасцю беларускіх прэсонімаў у межах адной семантычна ўпарадкаванай структуры, а таксама агульным кагнітыўна-камунікатыўным ракурсам даследавання.

**Выклад асноўнага матэрыялу.** Лінгвістычны статус назваў перыядычных выданняў як адзінак анамастыкі з'яўляецца канчаткова не вырашаным. Спрэчным застаецца пытанне аб уключэнні намінацый газет і часопісаў у канкрэтную групу онімнай прасторы. У слоўніку Н. У. Падольскай назвы перыядычных выданняў адносяцца да групы ідэонімаў і разглядаюцца як уласныя імёны "органаў перыядычнага друку, у тым ліку газет, часопісаў, інфармацыйных бюлетэняў" [19: 46]. На наш погляд, ва ўмовах актыўнага

© Сімановіч Вікторыя, 2019

ISSN 2078-5119 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Вип. 71. Ч. ІІ

развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій зводзіць паняцці “назва органа перыядычнага друку” і “назва перыядычнага выдання” да аднаго знамянальніка немэтазгодна.

У дысертацыйным даследаванні І. В. Крукава пад тэрмінам *гемеронім* разумее “назвы сродкаў масавай інфармацыі” [11], якія, у сваю чаргу, акрамя назваў газет, часопісаў, бюлетэняў і г. д., уключаюць назвы радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальных праграм. У слоўніку Д. Бучко і Н. Ткачовай *гемеронімам* называецца від ідэоніма, падвід хрэматоніма, уласная назва органа перыядычнага друку і інфармацыі (газеты, часопіса, інфармацыйнага бюлетэня, тэлевізійнага каналу, студыі, радыёстанцыі, інтэрнэт-выдання і інш.) [5: 67].

Такі падыход падаецца метадалагічна неабгрунтаваным. Частка лексічных адзінак, якія называюць сродкі масавай інфармацыі, характарызуецца наяўнасцю матэрыяльна выражанага аб’екта – дэнатата (прагматонімы: назвы газет, часопісаў, бюлетэняў і інш.). Другая частка назваў вызначаецца сігніфікатыўным зместам і не мае матэрыяльна выражанага аб’екта (ідэонімы: назвы радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальных праграм і г. д.). Абедзве падгрупы ва ўсходнеславянскай лінгвістыцы практычна не вывучаліся і таму не маюць у анамастыцы агульнапрынятага спосабу намінацыі. Аднак відавочна, што тэрмін *гемеронім* абазначае адзінкі розных класіфікацыйных кластараў і таму з’яўляецца малапрыдатным для далейшага выкарыстання.

Як вядома, анамастыка – адзін з нешматлікіх раздзелаў лінгвістыкі з т. зв. адкрытай тэрмінасістэмай. Яшчэ ў 1978 г. Н. У. Падольская дапускала магчымасць утварэння тэрмінаў-неалагізмаў для абазначэння новых класаў анамастычных аб’ектаў. У прадмове да “Словаря русской ономастической терминологии” адзначаецца: “<...> былі ўключаны ў слоўнік тэрміны-футуронімы, якія яшчэ не выкарыстоўваюцца ў навуковай літаратуры, але з’яўленне якіх можна прагназаваць, паколькі адпаведнае паняцце ўжо існуе, але пакуль мае форму выражэння ў выглядзе свабоднага словазлучэння, напрыклад, назва ветру або стыхійнага бедства (анемонім), назва любой узнагароды або знаку адрознення (фалеронім) <...>. Гэтыя тэрміны створаны строга па мадэлі анамастычнага тэрміна, з грэчаскім тэрмінаэлементам у аснове і прапануюцца даследчыкам як адзін з магчымых варыянтаў тэрміна для дадзенага паняцця” [18: 15].

Сугучную думку выказалі Д. Бучко і Н. Ткачова: “Анамастыка, як і кожная галіна навукі, здольная развівацца, а таму яе тэрмінасістэма хоць і складае адносна замкнёны слоўнікавы кантэкст, межы якога абумоўлены канкрэтнай сацыяльнай арганізацыяй рэчаіснасці <…>, могуць дапаўняцца новымі назвамі для абазначэння новых паняццяў, з’яў або канкрэтных напрамкаў навукі <…>” [5: 19–20]. У адпаведнасці з такім падыходам мы прапануем для пазначэння найменняў газет, часопісаў, бюлетэняў, альманахаў і пад. выкарыстоўваць неалагізм *прэсонім* (ад англ. press ‘перыядычныя выданні’ + ст.-грэч. *onyma* ‘імя, назва’).

Гісторыя развіцця беларускамоўнага перыядычнага друку ахоплівае больш за 1000 гадоў існавання і прадстаўлена больш чым 2000 назвамі газет і часопісаў, якія адрозніваюцца сваімі структурна-граматычнымі, семантычнымі і прагматычнымі асаблівасцямі.

У адпаведнасці з колькасцю структурна-семантычных частак усю сукупнасць беларускіх прэсонімаў можна падзяліць на тры групы:

1) монакампанентныя прэсонімы: *Авангард* (Буда-Кашалёва, 1962; Карма, 1938; Лунінец, 1943; Уваравічы, 1958), *Бальшавік* (Вільня, 1924; Драгічын, 1950; Капаткевічы, Любань, 1935; Мінск, 1927; Мышанка, 1945), *Басаnож* (Мінск, 2005), *Да злучэння* (Вільня, 1932);

2) бікампанентныя прэсонімы: *Гродзенская праўда* (Гродна, 1939), *Жыццё беларуса* (Вільня, 1925), *Зара над Сожам* (Карма, 1967);

3) полікампанентныя прэсонімы: *Віцебская сялянская газета* (Віцебск, 1924), *На фронце сацыялістычнай свінагадоўлі* (Мінск, 1933), *Прафесіянальны рух Беларусі* (Мінск, 1925).

Вылучаныя групы таксама не з’яўляюцца аднароднымі. Так, у межах групы монакампанентных назваў вылучаюцца прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя адзінкі. Адзначым, што службовыя часціны мовы, якія ўваходзяць у склад прэсонімаў, не кваліфікуюцца намі як асобныя кампаненты. Яны не маюць свайго лексічнага значэння, а толькі паказваюць на розныя адносіны паміж самастойнымі часцінамі мовы.

Беспрыназоўнікавыя прэсонімы часцей за ўсё выражаны назоўнікамі: *Праца* (Вільня, 1927; Зэльва, 1967; Кобрын, 1954; Мінск, 1989), *Радавод* (Брэст, 1991), *Саха* (Вільня, 1912), *Ударнік* (Барысаў, 1930; Быхаў, Клімавічы, Крычаў, 1934; Гомель, 1929; Жлобін, 1931; Мінск, Шлоў, 1934).

Адрозніваюцца таксама назвы, выражаныя прыслоўямі: *Басанож* (Мінск, 2005), *Напагатове* (Мінск, 1933), *Наперад* (Вільня, 1929), *Рэанімова* (Гродна, 1989).

Прэсонімы з прыназоўнікамі ў структуры даволі шматлікія і разнастайныя. Найбольш пашыранымі з’яўляюцца адзінкі з прыназоўнікам *за*, які паказвае на чалавека, якую-небудзь справу і г. д., з мэтай забеспячэння (захавання) дабрабыту якіх ажыццяўляецца дзеянне, і назоўнікам ў родным склоне: *За калектывізацыю* (Багушэўск, 1931; Нароўля, 1932; Старыя Дарогі, 1931; Чашнікі, Халопенічы, 1930;), *За праўду* (Вільня, 1926; Навагрудак, 1944), *За Радзіму* (Бешанковічы, 1956; Жалудок, 1945; Камарын, Мазыр, 1943; Магілёў, 1944; Шарашова, 1947) і інш.

Найбольш пашыранай і разнастайнай групай прэсонімаў з’яўляюцца бікампанентныя найменні. У межах гэтай групы вылучаецца значная колькасць утваральных канструкцый, якія рэалізуюцца ў розных намінацыйных мадэлях. Найбольш пашыранымі з’яўляюцца канструкцыі **“Sub+Sub”**[1], “**Adj+Sub**”, а таксама іх мадыфікацыі з прыназоўнікам у прэпазіцыі **“pr+Sub+Sub”**, **“pr+Adj+Sub”**.

Канструкцыя **“Sub+Sub”** рэалізуецца ў дзвюх асноўных намінацыйных мадэлях. У пераважнай большасці прэсонімы ўтвараюцца далучэннем да назоўніка ў назоўным склоне назоўніка ў родным склоне: **“**$\mathbf{Sub}_{Н.\,скл.}+\mathbf{Sub}_{Р.\,скл.}$**”** (*Асновы мастацтва* (Мінск, 1995), *Ахова працы* (Мінск, 1993), *Веснік адукацыі* (Мінск, 2003), *Цягнік сацыялізма* (Гомель, 1929), *Штурм будаўніцтва* (Орша, 1932)), або далучэннем да назоўніка ў назоўным склоне назоўніка ў давальным склоне: **“**$\mathbf{Sub}_{Н.\,скл.}+\mathbf{Sub}_{Д.\,скл.}$**”** (*Воля народу* (Вільня, 1923), *Кансультацыя настаўніку* (Мінск, 1938), *Кніга масам* (Мінск, 1932), *Тэхніка масам* (Мінск, 1932)).

Адзінкі канструкцыі **“pr+Sub+Sub”** утвараюцца па наступных мадэлях, якія адрозніваюцца склонавымі формамі назоўнікаў: **“pr+**$\mathbf{Sub}_{В.\,скл.}+\mathbf{Sub}_{Р.\,скл.}$**”** (*За перамогу*

[1] Тут і далей выкарыстоўваюцца наступныя ўмоўныя абазначэнні: **Sub** (ад лац. *substantivum*) – назоўнік, **Adj** (ад лац. *adjectivum*) – прыметнік, **pr** (ад лац. *praepositio*) – прыназоўнік.

*камунізма* (Слонім, 1962), *За развіццё ільну* (Дрыса, 1931), *За сцяг першынства* (Гомель, 1932)), **“pr+Sub$_{В.\ скл.}$ +Sub$_{Д.\ скл.}$”** (*У дапамогу настаўніку* (Мінск, 1945), *У дапамогу самаадукацыі* (Мінск, 1928)), **“pr+Sub$_{В.\ скл.}$ +Sub$_{Т.\ скл.}$”** (*За ўладанне тэхнікай* (Мінск, 1931)), **“pr+Sub$_{М.\ скл.}$ +Sub$_{Р.\ скл.}$”** (*На ахове граніцы* (Заслаўе, 1939), *На варце Кастрычніка* (Мінск, 1931), *На варце краіны* (Барысаў, Мінск, 1930)).

Беспрыназоўнікавая канструкцыя “**Adj+Sub”** утвараецца з дапамогай назоўніка і залежнага ад яго прыметніка і прадстаўлена адзінай мадэллю **“Adj+Sub$_{Н.\ скл.}$”**: *Адкрытае грамадства* (Мінск, 1998), *Бальшавіцкі сцяг* (Дзяржынск, 1933; Ліда, Ляхавічы, 1950; Любань, 1934; Полацк, 1944; Полацк, 1938; Пухавічы, 1932; Рудзенск, Смілавічы, 1935; Целяханы, 1952;), *Браслаўская звязда* (Браслаў, 1963), *Гомельскі будзільнік* (Гомель, 1920), *Калгаснае жыццё* (Ганцавічы, Докшыцы, Івацэвічы, Лынтупы, Ражанка, 1950; Давыд-Гарадок, 1957; Ельск, Старыя Дарогі, 1938; Маладзечна, 1956; Ула, 1947; Чачэрск, 1958; Шарашова, 1945.

Канструкцыя **“pr+Adj+Sub”** разнастайная па мадэлях утварэння, а таксама функцыях прыназоўніка. Так, вылучаюцца мадэлі:

1) са злучнікам *да*, які паказвае на тое, да чаго заклікаюць: **“pr+Adj+Sub$_{Р.\ скл.}$”** (*Да новых перамог* (Клецк, 1943; Мядзель, 1963));

2) са злучнікам *за*, які выкарыстоўваецца пры ўказанні на асобу, справу і г. д., з мэтай забеспячэння (захавання) дабрабыту якіх ажыццяўляецца дзеянне: **“pr+Adj+Sub$_{В.\ скл.}$”** (*За бальшавіцкае мастацтва* (Мінск, 1936), *За высокі ўраджай* (Барыскавічы, Мір, Целяханы, 1950; Беразіно, Буда-Кашалёва, Лубінічы, Талачын, 1957; Гарадок, 1956; Лунінец, 1958), *За газетныя кадры* (Магілёў, 1935), *За крэпасць С.П.А.* (Мінск, 1934), За *культурную дарогу* (Мінск, 1935), *За ленінскае выхаванне* (Горкі, 1930), *За народную ўладу* (Гродна, 1994));

3) са злучнікам *пад*, што ў складзе прэсонімаў паказвае на асобу, падзею, ідэю і г. д., якія вызначаюць характар, змест дзеяння, працэсу [17: 266]: **“pr+Adj+Sub$_{М.\ скл.}$”** (*Пад ленінскім сцягам* (Ветка, 1956; Высачаны, 1930)).

Полікампанентныя адзінкі (у параўнанні з папярэднімі групамі) колькасна нешматлікія. Назвы перыядычных выданняў гэтых груп з’яўляюцца па сваёй будове складанымі ўтварэннямі, у якім можна выдзеліць галоўны і залежны кампаненты. Адзінкі трохкампанентных прэсонімаў прадстаўлены ў пераважнай большасці беспрыназоўнікавай канструкцыяй **“Adj+(Adj+Sub)”** і прыназоўнікавай канструкцыяй **“pr+Adj+(Sub+Sub)”**.

Канструкцыя **“Adj+(Adj+Sub)”** рэалізуецца ў мадэлі **“Adj+(Adj+Sub$_{Н.\ скл.}$)”**: *Брэсцкі геаграфічны веснік* (Брэст, 2001), *Беларускі гістарычны агляд* (Мінск, 1994), *Віцебская сялянская газета* (Віцебск, 1924). Канструкцыя **“pr+Adj+(Sub+Sub)”** прадстаўлена мадэллю **“pr+Adj+(Sub$_{В.\ скл.}$”+Sub$_{Р.\ скл.}$)”**: *За бальшавіцкія тэмпы свінагадоўлі* (Орша, 1934), *За здаровы лад жыцця* (Гарадок, 2000).

На першы погляд адзінкі тыпу *За аздараўленне працы і побыту* (Гомель, 1930), *За бальшавіцкі лес і сплаў* (Мазыр, 1934), *За своечасовы і якасны рамонт* (Дуброўна, 1935), *Ударнік леса і сплава* (Гомель, 1934; Нароўля, 1935; Петрыкаў, 1933) можна аднесці да групы трохкампанентных назваў. Аднак названыя намінацыі па сваіх сэнсава-граматычных асаблівасцях адносяцца да эліптызаваных, няпоўных назваў і таму належаць да групы прэсонімаў, якія ўключаюць у свой склад чатыры кампаненты.

ISSN 2078-5119 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Вип. 71. Ч. ІІ

Чатырох- і пяцікампанентныя прэсонімы прадстаўлены адзінкавымі назвамі. Прывядзём асобныя прыклады структурна-граматычнай характарыстыкі назваў груп. Чатырохкампанентная назва *Голас праўды Гродзенскай зямлі* (Гродна, 1921) утварылася па намінацыйнай мадэлі **“**$\mathbf{(Sub_{\text{Н. скл.}}+Sub_{\text{Р. скл.}})+(Adj+Sub_{\text{Р. скл.}})}$**”**, якая складаецца з двух структурна-семантычных блокаў, першы з якіх уключае ў сябе субстантыў з залежным ад яго назоўнікам ў родным склоне, другі – назоўнік і залежны ад яго прыметнік.

Пяцікампанентныя адзінкі прадстаўлены мадэллю **“**$\mathbf{Sub_{\text{Н. скл.}}+\{Adj+[Adj+(Sub_{\text{Р. скл.}}+Sub_{\text{Р. скл.}})]\}}$**”**, якая ўключае ў свой склад базавы субстантыў і залежны блок, у які ўваходзяць два назоўнікі ў родным склоне, пашыраныя за кошт паслядоўнага далучэння прыметнікаў: *Весткі Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўраду Беларусі* (Мінск, 1919), *Прызыўнік чацвёртага, заключнага года пяцігодкі* (Полацк, 1932).

Аналіз назваў перыядычных выданняў актуальны і з боку апісання іх семантычных асаблівасцей.

Назвы газет і часопісаў у залежнасці ад палітычнай сітуацыі, узроўню развіцця краіны ў пэўны перыяд і сацыяльных патрэб грамадства адрозніваюцца намінацыйнымі тэндэнцыямі, якія, у сваю чаргу, праяўляюцца на семантычным узроўні. Намі былі вылучаны чатыры перыяды ў фарміраванні беларускай прэсаніміі:

1) прапедэўтычны перыяд (1863–1918 гг.);

2) перыяд дынамічнага развіцця (1918–1930 гг.);

3) перыяд статычнага існавання (1940–1990);

4) сучасны перыяд (1990–наш час).

Аналіз прэсонімаў паказаў, што ўсю сукупнасць назваў перыядычных выданняў з боку іх семантычных асаблівасцей можна падзяліць на дзве групы: тэматычна маркіраваныя назвы і тэматычна нейтральныя. Пры аналізе семантычных асаблівасцей прэсонімаў найбольшую складанасць выклікаюць тэматычна маркіраваныя бікампанентныя адзінкі, у якіх трэба вызначаць сэнсава апорны і нейтральны кампаненты.

Як вядома, “для метадаў семантыкі найбольш агульнымі аказваюцца праблемы крыніцы моўнага матэрыялу і крытэрыяў яго ацэнкі” [10: 72]. На падставе граматычна-семантычнага падыходу намі распрацаваны крытэрыі для размежавання сэнсава апорнага кампанента назвы (тэматычна маркіраванага) і семантычна перыферыйнага кампанента. Полікампанентныя адзінкі з пункту гледжання іх семантыкі мы не разглядаем, паколькі, у адпаведнасці з поглядамі Р. Барта, любыя складаныя адзінкі з’яўляюцца камбінацыяй адзінак элементарнага ўзроўню, якімі ў дадзеным выпадку з’яўляюцца аднакампанентныя і двухкампанентныя прэсонімы [1: 203].

Ахарактарызуем асноўныя семантычныя асаблівасці прэсонімаў па асобных храналагічных перыядах.

Прапедэўтычны перыяд вызначаецца ўзнікненнем тэндэнцыі да станаўлення нацыянальнай перыёдыкі. У гэты час з’явіліся першыя газеты, пераважная большасць назваў якіх адносіцца да групы тэматычна нейтральных найменняў: *Крыніца* (Вільня, 1917), *Наша доля* (Вільня, 1906), *Наша ніва* (Вільня, 1906), *Свабода* (Мінск, 1902; Лябёдка, 1903).

Перыяд дынамічнага развіцця – найбольш прадуктыўны для беларускага перыядычнага друку. За два дзесяцігоддзі з’явілася прыкладна тысяча газет і часопісаў (што складае больш за 45 % ад агульнай колькасці назваў беларускіх перыядычных

ISSN 2078-5119 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Вип. 71. Ч. II

выданняў). Гэты перыяд характарызуецца разнастайнасцю назваў газет і часопісаў з боку іх лексіка-семантычных асаблівасцей. Асноўная частка прэсонімаў адносіцца да тэматычных груп **“грамадска-палітычнае жыццё”** і **“сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль”**.

У межах групы “грамадска-палітычнае жыццё” намі вылучаны шэраг падгруп. Асноўная частка прэсонімаў належыць да наступных з іх:

1) грамадска-палітычная фармацыя, партыя, арганізацыя, прыналежнасць да іх і пад.: *Бальшавіцкая трыбуна* (Барысаў, 1918), *За сацыялістычнае будаўніцтва* (Дуброўна, 1931), *Камуністычнае выхаванне* (Мінск, 1930), *Палітаддзельская праўда* (Асвея, Асіповічы, Віцебск, Хойнікі, 1934; Полацк, Цялуша, Шклоў, 1933);

2) асоба як суб’ект грамадска-палітычнага жыцця: *Бальшавік Кругляншчыны* (Круглае, 1935), *Камсамолец* (Паперня, 1931), *Голас мопраўца* (Гомель, 1931), *Палітычны вязень* (Вільня, 1924);

3) грамадска-палітычная супольнасць людзей: *Воля народу* (Вільня, 1923), *Вясковая камсамолія* (Полацк, 1925), *Камсамолія Віцебшчыны* (Віцебск, 1931), *Мазырская камсамолія* (Мазыр, 1924).

Група “сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль” характарызуецца наяўнасцю 4 падгруп, найбольш прадстаўнічыя з іх наступныя:

1) арганізацыя/прадпрыемства, галіна сельскай гаспадаркі/прамысловасці: *За калгас* (Рэчыца, 1930), *За ўдарны камбінат* (Орша, 1933, 1935), *Калгаснае жыццё* (Ельск, Старыя Дарогі, 1938), *Фабрыка бекона* (Гомель, 1933), *Спажывецкая кааперацыя* (Мінск, 1927);

2) асоба ў сферы сельскай гаспадаркі, прамысловасці: *Голас краўца* (Гомель, 1930; Мінск, 1929), *Кааператар* (Мінск, 1932), *Калектывіст Расоншчыны* (Расоны, 1932), *Кімавец* (Віцебск, 1932), *Лісток паляўнічага* (Мінск, 1934), *Ударнік-лугавод* (Палата, 1932).

Перыяд статычнага існавання беларускай прэсаніміі характарызуецца ўзнікненнем значнай колькасці назваў-амонімаў. Прэсонімы, якія ўтвараліся, за кароткі тэрмін станавіліся папулярнымі ў розных гарадах і іншых населеных пунктах краіны. Так, напрыклад, газета пад назвай *Калгаснае жыццё* выдавалася ў 9 населеных пунктах Беларусі (Ганцавічы, Докшыцы, Івацэвічы, Лынтуны, Ражанка, 1950; Давыд-Гарадок, 1957; Маладзечна, 1956; Чачэрск, 1958; Шарашова, 1945), газета з назвай *Зара камунізма* выходзіла ў 7 населеных пунктах (Бялынічы, Міёры, 1962; Высокае, 1958; Добруш, 1956; Івацэвічы, 1956; Крупкі, 1960; Маліноўшчына, 1950).

Пераважная большасць назваў перыядычных выданняў, што з’явіліся ў дадзены перыяд, належаць да групы **“грамадска-палітычнае жыццё”** і **“сельская гаспадарка і прамысловасць”**.

У межах групы “грамадска-палітычнае жыццё” найбольш пашыранымі з’яўляюцца падгрупы:

1) грамадска-палітычная фармацыя, партыя, арганізацыя, прыналежнасць да іх і пад.: *Бальшавіцкі шлях* (Ліда, 1950; Целяханы, 1952), *Будаўнік камунізму* (Любань, 1963; Ляхавічы, 1962), *За камунізм* (Барысаў, 1952; Бераставіца, 1967; Глыбокае, 1958; Грэск, 1956; Дуброўна, 1960; Калінкавічы, 1962; Капаткевічы, 1953; Крупкі, 1957; Міёры, Паставы, 1950), *За камуністычную працу* (Магілёў, 1962; Лоеў, 1959), *Зара камунізма* (Высокае, 1958; Івацэвічы, Добруш, 1956; Крупкі, 1960; Маліноўшчына, 1950; Міёры, Бялынічы, 1962);

2) які мае дачыненне да пэўнай гістарычнай асобы: *Заветы Ільіча* (Крывічы, 1951), *Ленінец* (Браслаў, Ганцавічы, Давыд-Гарадок, 1950; Высокае, 1945; Добруш, Камянец, 1962; Заслаўе, Церахоўка, 1958; Лагішын, 1944; Талачын, 1960; Рагачоў, Рыжкавічы, 1957), *Ленінская праўда* (Віцебск, Ельск, 1962; Мікашэвічы, 1959; Докшыцы, 1946; Дзяржынск, 1941; Нароўля, 1956), *Па сталінскаму шляху* (Ельчыцы, 1948; Крулеўшчызна, Поразава, Янушова, 1950), *Пад сцягам Сталіна* (Валеўка, 1950).

Найбольш пашыранай падгрупай у групе "сельская гаспадарка і прамысловасць" з'яўляецца падгрупа "асоба ў сферы сельскай гаспадаркі, прамысловасці": *Голас калгасніка* (Лаздуны, Ліда, Слонім, 1950, Стараселле, 1959; Хойнікі, 1957), *Калгаснік* (Краснаполле, Целяханы, 1957), *Калгаснік Беларусі* (Аляхновічы, Радашковічы, 1950; Мінск, 1953), *Трыбуна хлебароба* (Гомель, 1956).

Сучасны перыяд характарызуецца новымі тэндэнцыямі ў намінацыі газет і часопісаў. Асноўная частка перыядычных выданняў названага перыяду належыць да тэматычна нейтральнай групы адзінак, а таксама ўтрымлівае ў сабе кампанент, які паказвае на дакладную лакалізацыю газеты або часопіса: *Аршанская газета* (Орша, 1991), *Бабруйскае жыццё* (Бабруйск, 1991), *Бярэзінская панарама* (Беразіно, 2003), *Воранаўская газета* (Воранава, 1991), *Калінкавіцкія навіны* (Калінкавічы, 1991), *Край Смалявіцкі* (Смалявічы, 1995).

Для вывучэння прэсонімаў істотным з'яўляецца анамасіялагічны аспект даследавання. Так, перыядычныя выданні на працягу свайго існавання даволі часта мянялі назвы. Найчасцей гэта звязана з палітычнымі зменамі ў грамадстве.

Перайменаванне як з'ява ў анамастычнай прасторы ўжо з'яўлялася аб'ектам увагі лінгвістаў. У пераважнай большасці вучоныя звярталіся да дэнамінацыі геаграфічных аб'ектаў. Так, перайменаванні ў рускай айканіміі вывучалі Г. П. Бандарук [2; 3], Т. А. Іванова [8], С. А. Нікіцін [16], Я. М. Паспелаў [20] і інш. Ва ўкраінскай лінгвістыцы праблему дэнамінацыі геаграфічных назваў распрацоўвалі Д. Р. Бучко [4], А. А. Купчынскі [12] і іншыя. У беларускім мовазнаўстве перайменаванне айконімаў даследавалі В. А. Жучкевіч [7], А. В. Кавалёва [9], В. П. Лемцюгова [13], Л. М. Лыч [14] і інш.

Дастаткова складанай праблемай з'яўляецца распрацоўка метадалогіі апісання асаблівасцей дэнамінацыі прэсонімаў, паколькі перайменаванні газет і часопісаў адрозніваюцца сваёй частотнасцю, а новаўтвораныя найменні часта маюць іншыя структурныя і семантычныя характарыстыкі.

Сустракаюцца прэсонімы, якія змянялі сваю назву некалькі разоў. Так, напрыклад, газета горада Віцебска з першапачатковай назвай *Калгасная трыбуна* мела наступныя назвы: *Калгасная трыбуна*$_{1938}$ → *Ленінская праўда*$_{1962}$ → *Жыццё Прыдзвіння*$_{1994}$. У Мінску газета пад назвай *Беларуская вёска* змяняла сваю назву 5 разоў: *Беларуская вёска*$_{1921}$→ *Калгаснік Беларусі*$_{1931}$→ *Советский крестьянин*$_{1948}$ → *Колхозная правда*$_{1950}$→ *Сельская газета*$_{1962}$→ *Белорусская нива*$_{1991}$. Дзяржынская газета (на момант з'яўлення газеты горад меў назву Койданава) *Чырвоны Койданавец* мяняла сваю назву наступным чынам: *Чырвоны Койданавец*$_{1929}$→ *Трактар*$_{1930}$→ *Ударнік Койданаўшчыны*$_{1932}$ → *Ударнік Дзяржыншчыны*$_{1934}$→ *Ленінская праўда*$_{1941}$→ *Сцяг кастрычніка*$_{1963}$→ *Узвышша*$_{2011}$.

Логіка перайменаванняў, спецыфіка ўплыву экстралінгвістычных фактараў, моўныя асаблівасці новаўтвораных найменняў уяўляюць несумненную навуковую цікавасць і павінны стаць самастойным аб'ектам увагі лінгвістаў.

**Вывады**. Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы.

1. Ва ўсходнеславянскай лінгвістыцы адсутнічаюць грунтоўныя работы, прысвечаныя апісанню назваў перыядычных выданняў. Разам з тым прэсанімія ўвогуле і беларускай прэсанімія ў прыватнасці характарызуецца спецыфічнымі структурна-граматычнымі, семантычнымі і прагматычнымі асаблівасцямі.

2. У адпаведнасці з колькасцю структурна-семантычных частак вылучаюцца монакампанентныя, бікампанентныя і полікампанентныя прэсонімы. Найбольш пашыраныя бікампанентныя найменні. У іх межах вылучаецца значная колькасць утваральных канструкцый, што рэалізуюцца ў розных намінацыйных мадэлях ("назоўнік + назоўнік", "прыметнік + назоўнік", іх мадыфікацыі з прыназоўнікам у прэпазіцыі і інш.).

3. На сістэму прэсонімаў істотна ўплываюць экстралінгвістычныя фактары (узровень развіцця краіны, сацыяльныя патрэбы грамадства, палітычныя прыярытэты і інш.), якія закранаюць найперш семантычны ўзровень сістэмы найменняў газет і часопісаў. Найбольш прадуктыўным і цікавым для навуковага назірання з'яўляецца перыяд дынамічнага развіцця беларускай прэсаніміі, які ахоплівае 1918–1930-я гг.

4. Для далейшага комплекснага вывучэння сістэмы прэсонімаў неабходна выпрацаваць крытэрыі несупярэчлівага аналізу дэнамінацыйных працэсаў у сістэме назваў перыядычных выданняў. Ён павінен закранаць структурны, семантычны і прагматычны аспекты функцыянавання онімаў.

**Перспектывы выкарыстання вынікаў даследавання.** Асноўныя палажэнні і вывады даследавання могуць быць выкарыстаны ў тэарэтычных работах па анамастыцы і анамасіялогіі; распрацаваныя прынцыпы аналізу сістэмы беларускіх прэсонімаў знойдуць прымяненне пры вывучэнні розных класаў беларускіх онімаў. Матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца для далейшага ўнармавання нацыянальнай онімнай лексікі ў плане кадыфікацыі і ў плане функцыянавання; пры складанні рознага тыпу слоўнікаў і даведнікаў сучаснай беларускай мовы; у працэсе выкладання беларускай мовы і журналістыкі ў вышэйшых навучальных установах; пры стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па анамастыцы, беларускай мове і гісторыі журналістыкі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. *Барт Р.* Введение в структурный анализ повествовательных текстов / Р. Барт // Французская семиотика: от структурализма к постструктурализму / сост., пер. и вступ. ст. Г. К. Косикова. – Москва : Прогресс, 2000. – С. 196–238.

2. *Бондарук Г. П.* Новые названия на территории СССР / Г. П. Бондарук // Топонимика СССР : сб. ст. / редкол. Е. М. Поспелов [и др.]. – Москва : Акад. наук СССР, 1990. – С. 81–86.

3. *Бондарук Г. П.* О практике переименования населенных пунктов РСФСР / Г. П. Бондарук // Прикладная топонимика : сб. науч. ст. – Москва : Центр. Науч.-исслед., 1981. – Вып. 230. – С. 5–13.

4. *Бучко Д. Г.* Историческая ойконимия Украины в свете послевоенных переименований / Д. Г. Бучко, Н. Г. Бучко // Исторические названия – памятники культуры : материалы 2

Всесоюз. науч.-практ. конф., Москва, 3–5 июня 1991 г. : в 3 ч. / Моск. фил. Геогр. о-ва СССР ; редкол. : Н. В. Нерознак (отв. ред) [и др.]. – Москва, 1991. – Ч. 1. – С. 38.

5. *Бучко Д.* Словник української ономастичної термінології / Д. Бучко, Н. Ткачова. – Харків : Ранок-НТ, 2012. – 256 с.

6. *Годуйко Л.* Гемеронимы города Бреста / Л. Годуйко, О. Стеренчук // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 2011. – С. 90–96.

7. *Жучкевич В. А.* Топонимика Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Наука и техника, 1968. – 184 с.

8. *Иванова Т. А.* К вопросу о переименованиях и наименованиях населенных пунктов / Т. А. Иванова // Учен. зап. Урал. гос. ун-т. – Свердловск, 1977. – Вып. 12 : Русская топонимия и географическая терминология. – С. 49–59.

9. *Кавалёва А. В.* Перайменаванні ў сістэме назваў населеных пунктаў Беларусі (1919–1991 гг.) : лінгвагістарычны, арэальны аспекты : дыс. … канд. філ. навук : 10.02.01 / А. В. Кавалёва. – Мазыр, 2012. – 146 с.

10. *Кронгауз М. А.* Семантика : учебник / М. А. Кронгауз. – 2-е изд., испр. и доп. – Москва : Академия, 2005. – 352 с.

11. *Крюкова И. В.* Рекламное имя: от изобретения до прецедентности : автореф. дис. … д-ра фил. наук : 10.02.19 / И. В. Крюкова ; Волгоградский государственный педагогический университет. – Волгоград, 2004. – 44 с.

12. *Купчинский О. А.* О переименованиях населенных пунктов на западноукраинских землях / О. А. Купчинский // Исторические названия – памятники культуры : материалы Всесоюз. науч.-практ. конф., Москва, 17–20 апреля 1989 г. : в 2 ч. / Моск. фил. Геогр. о-ва СССР ; редкол. : Р. А. Агеев (отв. ред) [и др.]. – Москва, 1989. – С. 105–106.

13. *Лемцюгова В.* Роздум над лёсам і правапісам беларускіх уласных геаграфічных назваў / В. Лемцюгова // Звязда. – 2002. – 3–6 крас. – С. 3–5; – 10 крас. – С. 4.

14. *Лыч Л. М.* Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 128 с.

15. *Мухаметзянова Л. Р.* Названия газет и журналов: функционально-прагматический аспект : автореф. дис. … канд. фил. наук : 10.02.01 / Л. Р. Мухаметзянова ; Казанский (Приволжский) федеральный университет. – Казань, 2018. – 27 с.

16. *Никитин С. А.* Лингвистические аспекты переименований географических объектов в России : дис. … канд. фил. наук : 10.02.21 / С. А. Никитин. – Москва, 2003. – 220 с.

17. Объяснительный словарь русского языка / Государственный институт русского языка им. А. С. Пушкина. – 2-е изд., испр. – Москва : Астрель, 2003. – 421 с.

18. *Подольская Н. В.* Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская; отв. ред. А. В. Суперанская. – Москва : Наука, 1978. – 198 с.

19. *Подольская Н. В.* Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : Наука, 1988. – 192 с.

20. *Поспелов Е. М.* Переименование города и сел в СССР / Е. М. Поспелов // Топонимика СССР : сб. ст. / Акад. наук СССР, Моск. фил. Геогр. о-ва СССР ; под науч. ред. Е. М. Поспелова – Москва, 1990. – С. 54–73.

## REFERENCES

1. Bart, R. (2000). Vvedenie v strukturnyy analiz povestvovatel'nyh tekstov. In: *Francuzskaya semiotika: ot strukturalizma k poststrukturalizmu* / sost., per. i vstup. st. G. K. Kosikova. Moskva: Progress, 196–238.

2. Bondaruk, G. P. (1990). Novye nazvaniya na territorii SSSR. In: *Toponimika SSSR : sb. st.* / redkol. E. M. Pospelov [i dr.]. Moskva: Akad. nauk SSSR, 81–86.

3. Bondaruk, G. P. (1981). O praktike pereimenovaniya naselennyh punktov RSFSR. In: Prikladnaya toponimika: sb. nauch. st. Moskva: Centr. Nauch.-issled., *vyp. 230,* 5–13.

4. Buchko, D. G., Buchko, N. G. (1991). Istoricheskaya oykonimiya Ukrainy v svete poslevoennyh pereimenovaniy. In: *Istoricheskie nazvaniya – pamyatniki kul'tury : materialy 2 Vsesoyuz. nauch.-prakt. konf., Moskva, 3–5.06.1991: v 3 ch.* / Mosk. fil. Geogr. o-va SSSR ; redkol. : N. V. Neroznak (otv. red) [i dr.]. Moskva, *ch. 1*, 38.

5. Buchko, D., Tkachova, N. (2012). *Slovnyk ukrainskoi onomastychnoi terminolohii*. Kharkiv: Ranok-NT.

6. Goduyko, L., Sterenchuk, O. (2011). Gemeronimy goroda Bresta. In: *Mounakulturnaya prastora Brescka-Pinskaga Palessya: zb. navuk. art*. / Bresc. dzyarzh. un-t imya A. S. Pushkina ; redkal.: M. M. Alyahnovich [i insh.]. Brest, 90–96.

7. Zhuchkevich, V. A. (1968). *Toponimika Belorussii*. Minsk: Nauka i tehnika.

8. Ivanova, T. A. (1977). K voprosu o pereimenovaniyah i naimenovaniyah naselennyh punktov. In: *Uchen. zap. Ural. gos. un-t*. Sverdlovsk, *vyp. 12: Russkaya toponimiya i geograficheskaya terminologiya*, 49–59.

9. Kavaliova, A. V. (2012). *Pierajmienavanni ŭ sistemie nazvaŭ nasielienych punktaŭ Bielarusi (1919–1991 hh.): linhvahistaryuny, areaeny aspiekty: dys. ... kand. fil. navuk : 10.02.01*. Mazyr.

10. Krongauz, M. A. (2005). *Semantika: uchebnik*. 2-e izd., ispr. i dop. Moskva: Akademiya.

11. Kryukova, I. V. (2004). *Reklamnoe imya: ot izobreteniya do precedentnosti : avtoref. dis. ... d-ra fil. nauk : 10.02.19* / Volgogradskiy gosudarstvennyy pedagogicheskiy universitet. Volgograd.

12. Kupchinskiy, O. A. (1989). O pereimenovaniyah naselennyh punktov na zapadnoukrainskih zemlyah. In: *Istoricheskie nazvaniya – pamyatniki kul'tury : materialy Vsesoyuz. nauch.-prakt. konf., Moskva, 17–20.04.1989: v 2 ch.* / Mosk. fil. Geogr. o-va SSSR ; redkol.: R. A. Ageev (otv. red) [i dr.]. Moskva, 105–106.

13. Lyemtsyuhova, V. (2002). Rozdum nad lyosam i pravapisam byelaruskikh ulasnykh hyeahrafichnykh nazvau. In: *Zvyazda, 3–6 kras.*, 3–5; *10 kras*., 4.

14. Lych, L. M. (1994). *Nazvy zyamli byelaruskay*. Minsk: Univyersitetskaye.

15. Muhametzyanova, L. R. (2018). *Nazvaniya gazet i zhurnalov: funkcional'no-pragmaticheskiy aspekt: avtoref. dis. ... kand. fil. nauk: 10.02.01* / Kazanskiy (Privolzhskiy) federal'nyy universitet. Kazan'.

16. Nikitin, S. A. (2003). *Lingvisticheskie aspekty pereimenovaniy geograficheskih ob'ektov v Rossii: dis. ... kand. fil. nauk: 10.02.21*. Moskva.

17. *Ob'yasnitelnyy slovar russkogo yazyka.* (2003). / Gosudarstvennyy institut russkogo yazyka im. A. S. Pushkina. 2-e izd., ispr. Moskva: Astrel'.

18. Podolskaya, N. V. (1978). *Slovar russkoy onomasticheskoy terminologii* / otv. red. A. V. Superanskaya. Moskva: Nauka.

19. Podolskaya, N. V. (1988). *Slovar russkoy onomasticheskoy terminologii*. 2-e izd., pererab. i dop. Moskva: Nauka.

20. Pospelov, E. M. (1990). Pereimenovanie goroda i sel v SSSR. In: *Toponimika SSSR : sb. st.* / Akad. nauk SSSR, Mosk. fil. Geogr. o-va SSSR; pod nauch. red. E. M. Pospelova. Moskva, 54–73.

## A PRESSONYM AS AN OBJECT OF BELARUSIAN ONOMASTICS

**Victoriya SIMANOVICH**

*Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University,*
*Department of Linguistics and Linguodidactics,*
*1/2, Soveth'ka Str., Minsk,, Belarus, 220072*
*phone (37517)3278044,*
*e-mail: simonovich.viktorija@mail.ru*

Proper names have been one of the most popular objects of linguistic research for a few decades. However, if some groups of onym vocabulary have been studied and described quite in detail, so the others are terra incognita. Hence, a lot of classes of proper names, which refer to the peripheral onomastic space, names of periodicals in particular, have not been researched in Eastern Slavic linguistics.

The history of development of Belarusian-speaking periodical press covers more than 1000 years of existence and it is presented by more than 2000 names of newspapers.

The aim of the work is presentation of Belarusian pressonymy as a system of onyms which possesses specific structurally grammatical, semantic, pragmatic characteristics.

The status of a pressonym as an onomastic unit is being considered in the article. The term "pressonym" has been substantiated for designating the aggregate of names of newspapers and magazines. The main peculiarities of denominations of Belarusian periodicals have been analyzed at different levels: structurally grammatical peculiarities of Belarusian pressonymy have been researched, separate semantic groups of names of newspapers and magazines have been analyzed, the problem of denomination of periodicals is being elucidated. One is proving the proposition that Belarusian pressonymy is a ramified system which was organized at formal, semantic and pragmatic levels.

The research, which has been done, allows to draw the following conclusions.

1. There are no thorough papers dedicated to the description of names of periodicals in Eastern Slavic linguistics. At the same time pressonymy in general and Belarusian pressonymy in particular are characterized by specific structurally grammatical, semantic and pragmatic peculiarities.

2. In accordance with the number of structurally semantic parts they single out monocomponent, bicomponent and polycomponent pressonyms. Bicomponent denominations are more widespread. Within their limits a considerable number of formative constructions are singled out, which is realized in different nomination models ("a noun + a noun", "an adjective + a noun", their modifications with a preposition in a pre-position and others).

3. The system of pressonyms is considerably influenced by extralinguistic factors (the level of a country's development, social needs of society, political priorities etc.), which affect in the first place a semantic level of the system of denominations of newspapers and magazines. The period of the dynamic development of Belarusian pressonymy, which covers 1918–1930, is the most productive and interesting for scientific observation.

4. It is necessary to elaborate the criteria of consistent analysis of denomination processes in the system of names of periodicals for further complex study of the system of pressonyms. It must affect the structural, semantic and pragmatic aspects of functioning of onyms.

*Keywords: o*nomastics, onyme, ideonym, pragmatonym, hemeronym, pressonym, pressonym component, marker component, denomination.